*Замкі, палацы і сядзібы ў кантэксце еўрапейскай культуры: мат-лы міжнар. навук.-практ. канф. (г.п. Мір, 25–26 красавіка 2013 г.). Мінск, 2013.*

*А. І. Дзярновіч*

# Заняпад ці трансфармацыя? Эвалюцыя статуса Крэўскага замка ў XIV–XVII ст. (па выніках гістарычна-археалагічных даследаванняў)

Крэўскі замак – адзін з першых мураваных замкаў-кастэляў ВКЛ (іл. 1). Дакладны час пабудовы Крэўскага замка застаецца дыскусійным – даследчыкі падаюць даты ад канца XIII ст. да 80-х гг. XIV ст. Класічнай застаецца версія пра пабудову замка пасля 1338 г. (да 1345 г.) Альгердам як сваёй уласнай рэзідэнцыі. Магчыма, будаўніцтва замка распачалося яшчэ Гедымінам. Альгерд атрымаў Крэва ад свайго бацькі князя Гедыміна ў 1338 г. У 1345 г. у Крэве было заключана кампраміснае пагадненне паміж Альгердам і пасламі Кейстута пра падзел улады ў ВКЛ. Указанай датыроўкі пабудовы замка – 1330-я гг. – першапачаткова прытрымліваўся Міхась Ткачоў[1] (хоць дапускаў, услед за гістарычнай традыцыяй XIX ст., 1320-я гг.)[2]. Часам уладарання Крэвам Альгердам (да 1345 г.) датуе пабудову замка Тадэвуш Поляк[3].

У 1980–1990-х гг. атрымала развіццё версія пра пачатак будаўніцтва Крэўскага замка ў канцы XIII – пачатку XIV ст., актыўна падтрыманая беларускімі археолагамі (Міхасём Ткачовым, Алегам Трусавым[4], Ігарам Чарняўскім[5]). Але ўпершыню падобную версію яшчэ ў першай палове

1 Ткачоў М. А. Замкі Беларусі (XIII–XVII ст.). Мінск, 1977. С. 33; Ткачев М. А. Замки Беларуси. Минск, 2002. С. 38.

2 Ткачоў М. А. Абарончыя збудаванні заходніх зямель Беларусі XIII–XVIII стст. Мінск, 1978. С. 34; Ткачоў М. Загінуўшыя абаронцы // Страчаная спадчына. Мінск, 1998. С. 14.

3 Polak T. Zamki na Kresach: Białoruś, Litwa, Ukraina. Wyd. 2. Warszawa, 1997. S. 153.

4 Ткачев М. А., Трусов О. А. Исторические и архитектурно-археологические исследования Кревского замка // Вопросы архитектуры Литовской ССР. 9 (1), 1988. С. 3; Трусаў А. А. Старонкі мураванай кнігі: манументальная архітэктура эпохі феадалізму і капіталізму. Мінск, 1990. С. 55.

5 Чарняўскі І., Цэйтліна М. Архітэктурна-мастацкія асаблівасці Крэўскага замка // Каштоўнасці мінуўшчыны. Вып. 4: Помнікі археалогіі: праблемы аховы і вывучэння. Мінск, 2001. С. 97.

© *А. І. Дзярновіч*



pawet.net

1960-х гг. выказаў літоўскі архітэктар Стасіс Абрамаўскас[6]. У якасці аргумента фігуравалі некаторыя асаблівасці будаўнічай тэхнікі – менавіта, архаічныя рысы ніжніх зон муроўкі сцен, выкладзеных на глінянай рошчыне, а таксама дабаўленне ў вапнавую рошчыну дробленай цэглы, што ў Балтыйскім рэгіёне датуецца XIII ст.

Падставы для дыскусіі даюць таксама сведчанні пісьмовых крыніц. «Хроніка Літоўская і Жамойцкая» паведамляе, што Гедымін, «всех сынов за живота своего порядне поделив панствами уделными, забегаючи внутрней домовой незгоды», надзяліў «Олгердови Крево замок»[7]. Хроніка не дае дакладнай датыроўкі гэтай падзеі, але змяшчае гэтыя звесткі паміж 1323 і 1328 гг., хоць трэба разумець умоўнасць гэтага датавання. У любым выпадку, з гэтай цытаты вынікае, што Крэва было перададзена Альгерду (каля 1296–1377) яшчэ пры жыцці яго бацькі Гедыміна (каля 1275–1341). Трэба таксама звярнуць увагу на тое, што Крэва было адзіным названым з акрэсленнем «замак». Але пры аналізе гэтых сведчанняў трэба памятаць, што сама «Хроніка Літоўская і Жамойцкая» была створана ў XVII ст. і шмат у чым блізкая (паўтарае) Хроніку Быхаўца і «Хроніку» Стрыйкоўскага. Звычайна, на звесткі па ранняй гісторыі Крэва спасылаюцца паводле «Хронікі Літоўскай і Жамойцкай»[8]. Хроніка Быхаўца, створаная ў першай палове XVI ст., паведамляе толькі, што Гедымін пасадзіў «Olgierda na Krewo»[9]. Само ж вызначэнне «Крэва замак» мы сустракаем у «Хроніцы» Мацея Стрыйкоўскага[10], але там характарыстыка сеньёрыяльных рэзідэнцый як замкаў пададзена і да такіх цэнтраў, як Кернаў, Слонім. Як бачым, выраз «Крэва замак» ёсць пазнейшым запісам у «Хроніцы» Стрыйкоўскага, і адтуль ужо мог патрапіць у «Хроніку Літоўскую і Жамойцкую».

Але якая самая ранняя крыніца называе Крэўскі замак? Такая згадка ўтрымліваецца ў летапісным рэестры «А се имена всем градом рускым далним и ближним», складзеным, як паказаў Міхаіл Ціхаміраў, хутчэй за ўсё паміж 1387 і 1392 гг.[11] У ліку літоўскіх гарадоў прыгадваецца «Крев камен»[12].

Яшчэ адна крыніца канца XIV ст. паведамляе пра Крэва – «Новая Пруская хроніка» Віганда Марбургскага, створаная ў 1393–1394 гг. Ордэнскі храніст паведамляе пра зняволенне Кейстута ў Крэве («in Krewen») у 1382 г.[13]

6 Абрамаускас С. К вопросу генезиса крепостных сооружений типа кастель в Литве (на примере замка Медининкай) // Научные труды высш. учеб. заведений Лит. ССР. Строительство и архитектура. III. 1963. № 1. С. 83.

7 Полное собрание русских летописей. М., 1975. Т. 32. С. 41.

8 Ткачев М. А., Трусов О. А. Исторические и архитектурно-археологические исследования Кревского замка. С. 3.

9 Полное собрание русских летописей. Т. 32. С. 138.

10 Stryjkowski M. Kronika Polska, Litewska, Żmudzka i wszystkiej Rusi. Warszawa. T. I. S. 381.

11 Тихомиров М. Н. Русское летописание. М., 1979. С. 88.

12 Там жа. С. 95.

13 Die Chronik Wigands von Marburg / Originalfragmente, lateinische uebersetzung und sonstige ueberreste von Theodor Hirsch. // Scriptores rerum Prussicarum. Leipzig,

Менавіта гэтае першае, дакладна датаванае паведамленне і дало падставы літоўскаму даследчыку Альгірдасу Жалнерусу аднесці час будаўніцтва Крэўскага замка, як і іншых кастэляў ВКЛ, да 1370–1380-х гг. Такім чынам, мы маем яшчэ адзін храналагічны полюс пабудовы замка[14].

Найбольш жа абгрунтаваным застаецца традыцыйнае датаванне – 1330-я гг. Ва ўсякім выпадку, Крэўскі замак стаў адным з першых цалкам мураваных замкаў Вялікага Княства Літоўскага, дзе да той пары, як і на беларускіх землях увогуле, не існавала традыцый мураванага дойлідства аб'ектаў такога маштабу. Узводзіўся замак, відавочна, пры ўдзеле ганзейскіх майстроў.

Захаваліся копіі шасці лістоў вялікага князя літоўскага Гедыміна, напісаных на латыні ў Вільні ў 1323–1324 гг. і адрасаваных папу рымскаму Яну XXII, уладам ганзейскіх гарадоў Брэмена, Кёльна, Любека, Ростака, Грайфсвальда, Шцэціна і інш., а таксама нямецкім францысканцам і дамініканцам[15]. У лістах Гедымін заяўляў пра сваё жаданне прыняць хрысціянскую веру. Акрамя таго, у Літву запрашаліся рыцары, лекары, рамеснікі (шаўцы, цялежнікі, каменячосы, срэбнікі, балістарыі, солездабытчыкі, пекары), купцы, земляробы, рыбакі, а таксама святары. Усім запрошаным гарантавалася бяспека, свабода перамяшчэння, поўнае ці на некалькі гадоў вызваленне ад падаткаў і павіннасцяў. Лісты сведчаць аб імкненні літоўскага гаспадара да міжнароднага прызнання і дазваляюць бачыць у дзейнасці Гедыміна шырокую праграму эканамічнай, культурнай і ваеннай мадэрнізацыі Літвы. Менавіта пасля гэтай кампаніі запрашэнняў у Вялікім Княстве з'явіўся шэраг мураваных пабудоў абарончага дойлідства, якія да гэтага не былі ўласцівы нашым землям.

## Крэўскі замак як рэзідэнцыя

Сам Крэўскі замак, у Княскай вежы якога знаходзіліся жылыя памяшканні, паводле заключэння Ігара Чарняўскага, ляжыць у пачатках генеалогіі палацава-замкавых комплексаў у Беларусі[16]. Увогуле ж, першым выразна акцэнтаваў функцыі Крэўскага замка як рэзідэнцыі даследчык мастацтва Мікола Шчакаціхін[17]. Для такога меркавання сёння маюцца як сведчанні пісьмовых крыніц, так і інфармацыя, здабытая ў выніку археалагічных даследаванняў.

Крэўскі замак паўстаў як рэзідэнцыя аднаго з адгалінаванняў Гедымінавічаў – Альгерда, а потым і Ягайлы. У XIV ст. Крэўскі замак

1863. Band II. S. 620; Vygandas Marburgietis. Naujoji Prūsijos kronika / Vertė Rimantas Jasas; mokslinis redaktorius Kęstutis Gudmantas. Vilnius, 1999. P. 183.

14 Žalnierius A. The First Castle of Kaunas // Castella Maris Baltici VI. Contacts and Genetically Dwellings in the Castle Buildings. Vilnius, 2004. P. 229.

15 Chartularium Lithuaniae res gestas magni ducis Gedeminne illustrans. Gedimino laiškai / Parengė S. C. Rowell. Vilnius, 2003. P. 46–67.

16 Чарняўскі І. Развіццё палацава-замкавых комплексаў Беларусі ў канцы XV–XVII стст. // Сярэдневяковыя старажытнасці Беларусі: Новыя матэрыялы і даследаванні / Пад рэд. В. М. Ляўко. Мінск, 1993. С. 66.

17 Шчакаціхін М. Нарысы з гісторыі беларускага мастацтва. Мінск, 1993. С. 147–148.



pawet.net

выконваў функцыі адной з вялікакняскіх рэзідэнцый. Невыпадкова менавіта ў ім быў падпісаны акт уніі 1385 г.

У 1382 г. Нямецкі ордэн у Прусіі дапамог Ягайле, які ўцёк да іх, перамагчы Кейстута: князь Трокаў і Жмудзі, апошні абаронца паганскай Літвы быў схоплены. У Супрасльскім летапісе аб гэтым сказана так: «Князя великого Кестутия… оковав ко Криеву послали и всадили во вежю… И там во Криеве пятой нощи князя великого Кестутия удавили коморники князя великого Ягайлавы»[18]. Такі ж лес рыхтавалі Вітаўту, сыну Кейстута, які «седель во Криеве за твердою сторожею в комьнате»[19]. Вітаўт здолеў ратавацца ўцёкамі, а пазнейшыя крыніцы пакінулі нам беспасярэднія ўказанні на выкарыстоўванне Княскай вежы ў якасці жылых памяшкканняў. Пры гэтым у ніжнім ярусе вежы, вельмі верагодна, знаходзілася вязніца Кейстута. Жылыя памяшканні, верагодна, знаходзіліся на трэцім і чацвёртым ярусах, а другі ярус выкарыстоўваўся для гаспадарчых патрэбаў[20].

Трэба прызнаць, што да XVI ст. Крэўскі замак страціў сваё ваеннае значэнне. Да таго ж, ён стаў агульнадзяржаўным замкам, што фіксуе факт утварэння староства. Хутчэй за усё, можна было б чакаць заняпаду замка і пашырэння цытаты Герберштэйна ад 1526 г. на ўсю далейшую яго гісторыю: «Крэва – мястэчка з пакінутым замкам»[21]. З іншага боку, мы ведаем, што ў 1564 г., паводле спрэчных прававых падстаў, Жыгімонт Аўгуст перадаў Крэва палітэмігранту князю Андрэю Курбскаму.

Апрача таго, археалагічныя даследаванні ў Княскай (Кейстутавай) вежы замка выявілі значную колькасць фрагментаў фрэсак (сценапісу), якімі былі аздоблены скляпенні і аконныя праёмы данжона (іл. 2). Хімічна-тэхналагічны аналіз паказаў, што сценапіс мае тры пласты. Найранейшыя былі выкананыя ў XIV–XV стст. у тэхніцы *all-secco* (па сухой тынкоўцы), але на мяжы XVI–XVII стст. крэўскія роспісы былі часткова перапісаныя ў тэхніцы тэмпернага жывапісу[22]. Усё гэта сведчыць пра ўзнаўленне замка і далейшае яго функцыянаванне ў другой палове XVI – першай палове XVII стст. як службовай рэзідэнцыі ці цэнтра староства[23].

## Мястэчка

Трэба адзначыць, што археалагічнае вывучэнне Крэва адбываецца, пачынаючы з 1970 г. Але аб'ектам даследаванняў выступаў менавіта Крэўскі замак. Тэрыторыя ж самога гістарычнага мястэчка вывучана ў непараўнальна меншай ступені. У 1985 г. Аляксандрам Краўцэвічам з мэ-

[18] Супрасльская летопись // Полное собрание русских летописей. М., 1980. Т. 35. С. 63.

[19] Там жа. С. 63.

[20] Чарняўскі І., Цэйтліна М. Архітэктурна-мастацкія асаблівасці Крэўскага замка. С. 103.

[21] Герберштейн С. Записки о Московии. М., 1988. С. 212.

[22] Чарняўскі І., Цэйтліна М. Архітэктурна-мастацкія асаблівасці Крэўскага замка. С. 101.

[23] Пералік Крэўскіх старастаў і апісанне іх дзейнасці гл.: Дзярновіч А. І., Трусаў А. А., Чарняўскі І. М. Лёс Крэва. Мінск, 1993. С. 11–14.

таю вывучэння гісторыка-тапаграфічнай сітуацыі Крэва была праведзена шурфоўка (20 кв. м.) гістарычнага цэнтра мястэчка на ўсход і поўнач ад замка[24]. Культурны слой светла-шэрага колеру дасягае тут 2 м таўшчынёй. Самы ранні артэфакт, выяўлены пры тагачасных даследаваннях – венца непаліванага гаршчка XIV ст., выяўленае ў цэнтры мястэчка. Гэта дае падставы меркаваць, што вядомы нам цэнтр мястэчка ўзнік на прылеглай на ўсходзе да замка тэрыторыі і менавіта замак стаў цэнтрам новых урбанізацыйных працэсаў Крэва ў познім Сярэднявеччы і раннім Новым часе. У сацыяльна-гістарычным плане паказальна, што матэрыяльная культура замка выразна адрозніваецца ад знаходак у пластах XVI–XVII стст. на тэрыторыі мястчэка[25].

Паводле актавых крыніц канца XVIII ст. (актыкацыя пацвярджэння канцлера ВКЛ Аляксандра Сапегі ад 25 лютага 1795 г.) Магдэбургскае права быо нададзена месту Крэва актам 7 красавіка 1559 г.[26] Але паўнамоцтвы органаў самакіравання для Крэва ў XVI–XVII стст. застаюцца не да канца яснымі[27].

Але, у такім выпадку, не да канца зразумелым застаецца і размяшчэнне першапачатковага паселішча Крэва. Верагодна, цэнтр старажытнага паселішча да ўзвядзення замка знаходзіўся ля Крэўскага гарадзішча, якое размешчана па шляху на Смаргонь (у 2 км ад замка). У 1974 г. гэтае гарадзішча абследаваў Георгій Штыхаў, але раскопкі не праводзіліся[28]. Верагодна, менавіта ў тым месцы і быў заснаваны ў 1387 г. Ягайлам касцёл для хросту паганскай Літвы[29]. Але ўжо новы тып паселішча, якое з XVI ст. стане фігураваць у крыніцах як «места», а ў нашай сучаснай тэрміналогіі «мястэчка», узнікла вакол мураванага замка (іл. 3). Пісьмовыя крыніцы сведчаць, што ў XVIII ст. драўляная ратуша магдэбургскага места Крэва знаходзілася на тэрыторыі замка[30].

## Высновы

Такім чынам, можна сфармуляваць папярэднія высновы:

1) у другой палове XVI – першай палове XVII стст. Крэўскі замак не знаходзіўся ў руінах, а быў адбудаваны і выкарыстоўваўся як рэзідэнцыя.

[24] Краўцэвіч А. К. Гарады і замкі Беларускага Панямоння XIV–XVIII стст: Планіроўка, культурны слой. Мінск, 1991. С. 55, 105.

[25] Архіў Інстытута гісторыі НАН Беларусі. Дзярновіч А. І. Справаздача па археалагічных даследаваннях (раскопках) у в. Крэва Смаргонскага р-на Гродзенскай вобл. у 2011 г. С. 16–17.

[26] НГАБ, ф. 1776, воп. 1, спр. 1, арк. 1 адв.

[27] Дзярновіч А. Крэва: мястэчка і гісторыя // Адраджэнне. Гістарычны альманах. Мінск, 1995. Вып. 1. С. 112–113.

[28] Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі: Гродзенская вобласць. Мінск, 1986. С. 328, № 1419.

[29] Социально-политическая борьба народных масс Белоруссии. Конец XIV в. 1648 г. Минск, 1988. Т. 1. С. 15.

[30] Корева А. Развалины Кревского замка // Памятная книжка Виленской губернии на 1861 г. Вильно, 1861. Ч. 2. С. 60.

Пры гэтым Крэўскі замак страціў функцыі вялікакняскай рэзідэнцыі, як гэта было ў XIV ст., але стаў цэнтрам староства. Адбылася трансфармацыя публічных функцый, але заняпад функцый вайсковых;

2) функцыянаванне замка як вялікакняскай рэзідэнцыі і як цэнтру староства паўплывала на змены горадабудаўнічай сітуацыі ў Крэве – мястэчка ранняга Новага часу ўзнікала ўжо вакол замка. Такая схема развіцця мястэчка адпавядае еўрапейскай схеме развіцця гарадоў вакол сеньёрыяльных рэзідэнцый.



pawet.net